*А. А. Паўловіч (Беларусь)*

# ВОБРАЗ РАДЗІМЫ Ў ЛІРЫЦЫ МАКСІМА ТАНКА

Паэзія Максіма Танка заўсёды была і застаецца крыніцай духоўнасці. Творчасць мастака слова напоўнена пачуццямі, сугучнымі для розных чытацкіх пакаленняў і актуальнымі для кожнай эпохі, напрыклад, бязмернай любоўю да Радзімы.

Радзіма ў лірыцы паэта паказваецца як жывая істота, персаніфікуецца ў вобразе-канцэпце «Маці». У яе гонар Максім Танк складае песні-гімны, як у вершы («Шчаслівы, што пяю цябе, Радзіма...»). Максім Танк пачаў атаясамліваць Радзіму з Маці яшчэ ў даверасснёўскі перыяд творчасці. У тагачасных вершах на гэтую тэму выказваюцца патрыятычныя пачуцці: кожны радок выяўляе адданасць роднай зямлі, прызнанне ў вечнай прывязанасці. Адно са сведчанняў таму – верш «Ураклі, матуля, сына твайго людзі…». Паэт паўстае у вобразе дзіцяці – сына, якога «ўраклі» краявіды Радзімы, туботы і клопаты яе народа на вечнае служэнне-блуканне: «*Вось спачну мо' трохі ў туманах вішнёвых, / затапіўшы вочы мокрыя ў зару, / і далей пайду я праз лясы, дубровы, / па тваіх дарогах, Беларусь*» [2].

Любоў да родных мясцін у Максіма Танка лакалізуецца ў звычайных, паўсядзённых рэчах, з'явах, малюнках: верасавішчах, пагорках, лясах, «маланкамі скрэмзаных валунах», «дажджамі аплаканых курганах»... Але з любові да гэтых, здаецца, звычайных «маленькіх» з'яў вырастае вялікае

пачуццё да краіны – адзінай і ўнікальнай. «*Ёсць у сусвеце планета Зямля. / Ёсць на Зямлі той краіна адна, / А ў той краіне – прыстанішча, дзе / Сэрца званчэйшыя песні вядзе*» [2], – прызнаецца Максім Танк у вершы «Ёсць у сусвеце планета Зямля». Тут таксама выяўляецца нябачная сувязь, блізкая той, што ёсць паміж маці і сынам, якую ніхто не можа патлумачыць. Менавіта яна натхняе «дзіця», зноў вяртае яго на Радзіму – прыпасці «грудзьмі да яе».

У вершы «Радзіма» родны край узвышаецца: любоў да Беларусі са сферы адносін «маці – сын» пераводзіцца ў іншую: вобраз радзімы абагаўляецца, сакралізуецца. Паэт ставіцца да яе як да найвялікшай святыні, сустрэча з якой патрабуе адмысловых рытуалаў: «*Як сейбіт, выйшаўшы з сяўнёю поўнай, / Я кланяюся полю, хмарам, сонцу, / Як воін перад невядомым лёсам, / Я апранаю чыстую кашулю*» [2]. Па назіранні А. У. Жардзецкай, «у розны час тэматыка, праблематыка, ідэйная скіраванасць танкаўскай паэзіі былі разнастайныя, але ўся яго творчасць прасякнута найвялікшай любоўю да Радзімы, якая была для паэта неад’емным ад чалавечага існавання паняццем, велічным і святым» [1, с. 68].

Вобраз Айчыны ўзнікае ў танкаўскай лірыцы ваеннага перыяду. Так, у вершы 1944 года «Беларусь» мастак адкрывае чытачу «дзіўны вобраз» краіны-партызанкі. У творы паядноўваюцца розныя часавыя пласты: далёкае мінулае і ваенныя падзеі, у прыватнасці подзвіг лётчыка Мікалая Гастэлы, здзейснены на Беларусі: «*Я чуў у песні голас твой і бачыў хараство убору / у слуцкім казачным узоры, / ў радках кірыліцы святой. / Жывую летапісь вякоў, / што Нёманам, Дняпром шумела, / чытаў з граніта гарадоў / і з безымянных курганоў, / што азарыў агнём Гастэла*» [2]. Максім Танк выказвае веру ў лепшую будучыню краіны, што ўвасабляецца ў «каляровых» і »гукавых» жыццесцвярджальных метафарах: «свабодныя вятры», «яркія кастры», «полымя зары», «несмяротныя песні».

У мірныя гады вобраз Радзімы застаецца адным з галоўных у творчасці Максіма Танка. Паэт працягвае ўласную традыцыю: вобраз ствараецца дзякуючы спалучэнню побытавых рэалій і малюнкаў. Напрыклад, у вершы «На вуліцы, на якой я жыву…» такімі рэалістычна-паўсядзённымі дэталямі з’яўляюцца элементы ўрбаністычнага пейзажу: тралейбусныя прыпынкі, латочніцы з піражкамі, магазін забавак, кінатэатр, рамонтныя майстэрні, цырульня, пошта, кніжны кіёск… Паэт, як дзеці-школьнікі, захапляецца гэтым светам – любоў да горада, у якім жыве, выступае складнікам любові да Радзімы.

Аднак як бы ні любіў Максім Танк гарадскі пейзаж, крыніцай яго натхнення і эпіцэнтрам любові з’яўляецца родная Нарач і яе краявіды. Асаблівае месца ў спадчыне паэта займае вобраз сосен вакол Нарачы. У вершы «Наднарачанскія сосны» паэт выяўляе мясцовы патрыятызм, без якога немагчымая любоў да ўсёй краіны: «*Я, нават будучы глухім, / Між тысяч іншых сосен / Адрозніў бы іх пошум / І, нават будучы сляпым, / Абняўшы ці пацалаваўшы, / Іх пазнаў бы*» [2]. Стромкія сосны сімвалізуюць велічнасць Радзімы. Менавіта сярод іх нараджаліся самыя лепшыя вершы паэта.

З гэтых сосен была пабудавана хата, дзе будучы паэт пачаў спазнаваць свет: праз разглядванне марозных узораў на шыбе, чытанне першых кніжак, размовы з дзедам. Успамін пра дзеда і маленства ўвасоблены ў вершы «Мой родны кут». Вобраз Радзімы тут зноў неадлучны ад побыту: хата, стол для пачастунку, паляўнічы рог, дзедава стрэльба... Любоў да роднай старонкі звязана з самымі блізкімі людзьмі: дзядулем, бабкай, бацькам і маці. Прычым вобраз апошняй выступае ў дзвюх іпастасях – як паэтава матуля («Рукі маці») і як Маці-Радзіма.

Такім чынам, вобраз Радзімы ў разгледжаных вершах Максіма Танка паўстае праз карціны штодзённага і звычайнага, велічнага і сакральнага,

персаніфікуецца ў вобразе Маці. Вершы на гэтую тэму раскрываюць у асобе Максіма Танка паэта-патрыёта, адданага сына Беларусі.


**Літаратура**

1. Жардзецкая, А. У. «Шчаслівы, што пяю цябе, Радзіма…»: вобраз Бацькаўшчыны ў паэзіі Максіма Танка / А. У. Жардзецкая // Дзявятыя Танкаўскія чытанні : матэрыялы Міжнар. навук. канф. / Беларус. дзярж. пед. ун-т ; рэдкал. В. Д. Старычонак, І. М. Гоўзіч, Н. В. Заяц ; адк. рэд. В. Д. Старычонак. – Мінск : БДПУ, 2014. – С. 68–72.
2. Паэтычная старонка Максіма Танка [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://maksimtank.ru/. – Дата доступу: 24.09.2020.



*Н. Ю. Пераўалава (Беларусь)*


## ПРЫНАЗОЎНІКАВЫЯ СЛОВАЗЛУЧЭННІ Ў СТАРАБЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

Побач з формамі слоў галоўным сродкам выражэння сінтаксічных адносінаў у словазлучэннях з'яўляецца прыназоўнік. Прыназоўнікі ўжываюцца і рэалізуюць сваё значэнне толькі ў спалучэнні са склонавымі формамі імёнаў, яны дапаўняюць і ўдакладняюць значэнні склонаў.

У старабеларускай мове прыназоўнікавыя словазлучэнні складалі шматлікі і семантычна разнастайны клас сінтаксічных канструкцый, што абумоўлівалася вялікай колькасцю прыназоўнікаў, якія выступалі пры склонавых формах імён, і разнастайнасцю іх значэнняў. Выконваючы ў структуры сказа функцыю ўказання на сінтаксічныя адносіны паміж спалучальнымі словамі, прыназоўнікі ў той жа час не абмяжоўваюцца роляй фармальных паказчыкаў гэтых адносінаў: яны прыўносяць у іменныя, дзеяслоўныя і прыслоўныя канструкцыі сваё значэнне і разам з галоўным (кіруючым) словам вызначаюць склон залежнага слова. Як указваў акадэмік В. У. Вінаградаў, прыназоўнікі, служачы выражэннем «прасторавых, часавых, прычынных, мэтавых, прыналежных, інструментальных і іншых адносінаў паміж прадметамі, накладваюць свой адбітак і на прыроду адносінаў, якія ўзнікаюць паміж кампанентамі такіх словазлучэнняў» [1, с. 50]. Залежны назоўнік прыназоўнікавых словазлучэнняў можа выступаць у форме розных ускосных склонаў, аднак не ўсе з гэтых форм аднолькава ўжывальныя пры адных і тых жа разрадах знамянальных слоў. Найбольшай прадуктыўнасцю пры выражэнні прасторавых, прычынных і мэтавых адносінаў вызначаюцца словазлучэнні з родным, давальным і вінавальным склонам залежнага назоўніка.

Словазлучэнні з дзеясловам у ролі галоўнага слова займаюць першае месца сярод іншых тыпаў словазлучэнняў. Прадуктыўнасць гэтага тыпу можна патлумачыць тым, што дзеяслоў у ролі выказніка з'яўляецца прэдыкатыўным ядром сказа, у залежнасці ад яго знаходзяцца большасць дадзеных членаў сказа. Найбольшай разнастайнасцю вылучаюцца дзеяслоўна-іменныя словазлучэнні.

У якасці крыніцы фактычнага матэрыялу выкарыстоўваўся «Гістарычны слоўнік беларускай мовы» (далей ГСБМ). Спіс крыніц прыведзены ў т. 1 ГСБМ (с. 45–49), у гэтым артыкуле назвы крыніц падаюцца ў скарочаным выглядзе.

Пры выражэнні *прычынных адносінаў* прыназоўнік *про* ўжываецца ў значэнні «*з-за, праз, з прычыны, пры*»: тот статутъ… не был ешэ прогледан и рэвидован про во$^{s}$ну ꙋставичную которую вели есмо по вси тые чсы (Ст. 1556, 7; т. 29, с. 98); сын его, про хоробу свою ку отбиранъю присеги прыбыт не мог (АВК, XXXIX, 168, 1579; т. 29, с. 98); Естли бы сѧ трафило ижъбы шлѧхтичъ в летех шестьнадцати… ѡбвиненъ ѡ злоде$^{s}$ство… таковомꙋ про молодость летъ его не маеть быти поличоно за злоде$^{s}$ство (Ст. 1588, 535; т. 29,